**Ілля Коласаў**

# Ці бывае шчасце?

## *Частка першая*

Дзядзька Ігнат быў простым чалавекам. Ніхто пра яго нічога не казаў, бо казаць было нечага. "Бондарам ён быў, многа не браў", – усё, што аднавяскоўцу магчыма было ўспомніць пра яго. Сваю непрыкметнасць разумеў і сам Ігнат. Працаваў старанна, сумленна, але грошаў браў толькі на больш патрэбнае. Гэта жыццё яму падабалася.

За гэта бондара ў сваёй жа вёсцы звалі дурнем. Паважалі яго, можа, толькі дзеці, якім ён дазваляў прыходзіць да сябе. Бондар нічога і нікому не забараняў увогуле, але толькі дзецям было цікава глядзець на працу майстра. Яшчэ да вырабу можна было патрымаць вядро ці іншую рэч, якая потым будзе ў сваёй хаце. Насамрэч, усе яны толькі перашкаджалі, але Ігнату гэта толькі падабалася: яму не прыходзілася сумаваць. А сумаваць было чаму, бо галоўнай апоры – жонкі – даўно не стала з-за хваробы.

Быў сярод дзяцей заўсёды і сын Ігната – Даніла. Ён захапляўся не менш астатніх і нават сам з малых гадоў вучыўся нешта вырабляць. Але яго заўсёды цікавіла, чаму тата так жыве. Ён быў вельмі добрым бондарам, да таго ж адзіным на ўсю вёску. Колькі б маленькі Даніла не пытаўся, Ігнат толькі паводзіў вусам ды з усмешкай адказваў, што жыць трэба, як яно найлепей для самога сябе. "Маё жыццё у тым, што я захапляюся працай. Кожнай рэчы цешуся, як першай. І гэта патрэбна астатнім – ад малога да старога. Вось у чым маё багацце!" – навучаў бондар свайго пераемніка. Але той гэтага ніколі не разумеў.

## *Частка другая*

Гады ішлі, але нічога не змянялася. Бондар Ігнат працаваў як і раней, дзеці заходзілі паглядзець, а Даніла навучаўся. Але дзяцей было ўсё менш, Даніла пачынаў рабіць поспехі, а рукі станавіліся ўсё менш прыткімі – час рабіў сваё. З цягам часу пытанні сына ператварыліся ў спрэчкі са старым татам:

– Не можа быць ніякага шчасця, калі праца толькі для таго, каб зарабіць нейкія грошы, – прамовіў бацька.

– Ты сам казаў, што асалода ў самой працы і тым, что яна патрэбна! Можа, кошт вырабу заключаецца ў тым, наколькі іншым патрэбна гэтая рэч? Ты сам казаў пра гэта! Ты!

– Па-гэтаму ты лічыш, што можна абкрадаць людзей?

– Я ведаю кошт таго, што зрабіў. Мне патрэбны грошы і на мяне, і на цябе, і для каханай.

– Цябе ніколі не навучалі такому!

– Ніхто цябе не пытаў пра гэта! – злосна адказаў Даніла, пакідаючы хату, каб не чуць болей крыкаў бацькі.

А той, у сваю чаргу, застаўся са сваімі думкамі і пачуццямі. Ды тыя думкі ні да чаго добрага не прывялі, бо бязлітасна грызлі душу.

## *Частка трэцяя*

Бондар захварэў. Было зразумела, што без лекара Ігнат загіне, але дзе ж яму ўзяць на гэта грошы? Працаваць немагчыма. Тады Даніла вырашыў дзейнічаць. Кожны дзень ён працаваў у бацькоўскай майстэрні з бацькоўскай стараннасцю і юнацкім запалам.

Тата нічога не мог яму казаць, ды і не ведаў. А тым часам Даніла ззяў, таму як зараз яго праца мела куды большы сэнс. Аднавяскоўцы ахвотна куплялі новы тавар, які тыя расхвалілі на ўсю ваколіцу. У гэты час і каханая бондара-пераемніка была заўсёды побач – ад гэтага было лепш абодвум, таму і вырабляць стала лягчэй.

## *Частка чацвёртая*

Так, праз некалькі дзён у хату наведаўся лекар, а пасля і Ігнат зноў стаў на ногі.

– Што цяпер мне скажаш? Вось, што цябе выратавала! – задаволены сын указаў бацьку пальцам на некалькі цэбраў і цэлую бочку.

Той без слоў падышоў і ўзяў адну з іх:

– Неверагодна, – адкрыўшы рот, вымавіў старэча і паглядзеў на сына. Данілава майстэрства стала куды больш за яго асабістае. Ігнат заплакаў, адчуваючы правіну перад сынам.

У гэты час Даніла зразумеў сваё шчасце. Вось яно дзе! У той жа самай працы, дзе грошы не галоўнае. Шчасце ў самаўдасканаленні і радасці ад ўсёй сям’і. Вось што было патрэбна!